— Пока я чувствую себя человеком завтрашнего дня. Уйду, когда пойму, что начал сдавать позиции, стал бояться за себя, перестал стремиться к максимальным результатам.

У ААН цяпер ведаюць і пра Анатоля Ляўковіча

Рэспубліканская грамадская арганізацыя "Беларускі Хельсінкскі камітэт" (БХК) накiравала спецыяльнаму прадстаўніку генеральнага сакратара ААН па пытанні аб праваабаронцах Хіне Джылані інфармацыю, звязаную з сітуацыяй вакол выкладчыка Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта (БрДУ) імя А.С.Пушкіна, дацэнта, кандыдата філасофскіх навук Анатоля Ляўковіча, якога адмовілася атэставаць атэстацыйная камісія БрДУ.

"Анатоль Ляўковіч, — адзначаецца ў інфармацыі РГА БХК, — выкладае ва універсітэце 25 гадоў, і за гэты час яго праца ацэньвалася толькі станоўча". Праваабаронцы ўпэўнены, што "прычынай адмоўнага рашэння атэстацыйнай камісіі з'яўляецца насаджэнне дзяржаўнай ідэалогіі ў сістэме адукацыі, у якую не ўпісваюцца дэмакратычныя погляды і грамадская дзейнасць Анатоля Ляўковіча, члена РГА БХК, лідэра Брэсцкай абласной арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада)".

Ірына ЛЕЎШЫНА.

Яўген Шаціхін у Фларэнцыі

Упершыню Беларусь была прадстаўлена на прайшоўшай 6—14 снежня ў Фларэнцыі (Італія) IV міжнароднай выставе сучаснага мастацтва, удзел у якой бралі больш за 800 мастакоў з 74 краін.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе беларускага МЗС, на выставе экспанаваліся творы мастака з Рэчыцы Яўгена Шаціхіна. Яго працы атрымалі пазітыўную адзнаку журы і ўключаны ў афіцыйны каталог выставы, паведамілі ў прэс-службе. Удзел беларускага мастака ў міжнародным форуме мастацтваў, зазначаюць у МЗС, адлюстроўвае ўзрастаючае прызнанне сучаснага беларускага жывапісу.

Андрэй СЕРАДА.

Ці будзе віцебскае піва не горш за баварскае?

Адным з найбольш значных для эканомікі Віцебшчыны інвестыцыйных праектаў абяцае стаць стваранае напрыканцы 2003 года на базе Аршанскага піваварнага завода сумеснае беларуска-германскае прадпрыемства ў форме закрытага акцыянернага таварыства, 51 працэнт актываў якога належыць замежнаму боку.



Плануецца давесці гадавы выпуск піва ў Оршы да 600 тысяч дал з перспектывай збыту прадукцыі не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, ад канкурэнцыі з якой шмат год запар цярпелі страты півавары Віцебшчыны.

Праект прадугледжвае, што нямецкія партнёры, якія справядліва лічацца аднымі з сусветных лідэраў піваварнай справы, перададуць сваё майстэрства беларусам, а галоўнае — укладуць у аршанскае СП 6,5 мільёна долараў ЗША.

Падрыхтаваны ўсе неабходныя дакументы да рэалізацыі аналагічных інвестыцыйных праектаў на Віцебскім і Полацкім піўзаводах. Такім чынам, піваварная прамысловасць Віцебскай вобласці нібыта імкнецца ўзяць рэванш за правал альянсу мінскай "Крыніцы" з піцерскай "Балтыкай" і даць штуршок "прэзідэнцкай" праграме паскоранага развіцця піваварнай вытворчасці ў Беларусі, у структуры якой галіновыя прадпрыемствы Віцебшчыны займаюць значнае месца, а Віцебскі піўзавод, што з'яўляецца нашчадкам славутай яшчэ з дарэвалюцыйных часоў прыватнай піваварнай кампаніі "Левенбрэй", па ўстойлівасці традыцый і майстэрстве старэйшых спецыялістаў не саступае многім заводам Расіі, Украіны і нават Прыбалтыкі. Аршанскі, Полацкі і Глыбоцкі піўзаводы маладзейшыя за віцебскі, але іх калектывы за апошнія 20 год набылі неблагі вопыт, які, на жаль, губляе ўсялякі сэнс ва ўмовах адсутнасці абаротных сродкаў і 100-працэнтнай састарэласці ды зношанасці абсталявання.

Яшчэ адной балючай праблемай з'яўляецца хранічны дэфіцыт сыравіны — высакаякаснага піваварнага ячменю. Яго на Віцебшчыне і наогул у Беларусі вырошчваецца недастаткова, і ў вырашэнні гэтай задачы Германія наўрад ці дапаможа. Не дацягвае да належных стандартаў якасці і беларуская вада, хоць якраз у гэтым немцы, магчыма, і дапамогуць сваім новым партнёрам, паставіўшы на Віцебшчыну неабходнае ачышчальнае абсталяванне.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ОТКРОВЕННО

Василий СТРАЖЕВ:

«Я всегда хотел стать профессиональным футболистом»

Василий Стражев приступил к обязанностям ректора БГУ недавно, но журналисты уже успели ему порядком поднадоесть. В основном всех интересует Стражев как руководитель и чиновник. Я же попыталась увидеть в ректоре БГУ прежде всего человека...

— Я родился в июле 1944 года в городе Каменске Ростовской области, но там я никогда не был, — рассказывает Стражев. — Дело в том, что я родился в поезде. Но при этом считаю себя коренным минчанином.

— А как получилось, что Ваша мама в такой ответственный момент оказалась в поезде?

— Шел 1944 год. Моя мама была лейтенантом медицинской службы, отец — командовал артиллерийским полком. Поезд, в котором они ехали, перемещался с одной базы на другую. Время было еще военное...

— В какой школе Вы учились?

— Сначала я ходил в школу в Крупках — отца перебросили туда на службу. После возвращения в Минск я учился в школе №22. Учителя у меня были именитые. Например, русский язык преподавала сестра Аркадия Кулешова.

— А какие предметы были любимыми?

— Сложно сказать... Учительница русского языка была уверена, что я буду поступать на филологический факультет, учитель истории — что окажусь на истфаке. А я выбрал физику...

— Василий Иванович, а чем Вы любили (и любите) заниматься в свободное время?

— В школе у меня было два увлечения: чтение книг и футбол. У меня была большая мечта — я всегда хотел стать профессиональным футболистом. С 12 лет я играл за молодежную сборную, в 1961-м — в дублирующем составе минского "Динамо". Потом получил две травмы и ушел из футбола.



— А теперь за какую команду болеете?

— До распада СССР болел за минское "Динамо", теперь — за московский "Спартак".

— Вернемся к учебе. После окончания школы для Вас существовала проблема выбора специальности?

— Нет. Я хотел поступить в МГУ. Приехал в Москву, но вместо того чтобы готовиться к экзаменам, месяц гулял по музеям. После этого поступать не решился и вернулся в Минск.

— В университете, как правило, молодых людей настигает первая любовь...

— Первая любовь пришла ко мне именно в университете. Я был влюблен в свою однокурсницу Людмилу. Поскольку я был секретарем комитета комсомола факультета, все знали о моей любви. Но, как это часто случается, наша любовь не завершилась браком. Хотя я считаю, что по сравнению с первой любовью все остальные чувства кажутся мелочами. Первая любовь всегда готовит к последующей жизни...

— Василий Иванович, а Вы праздники любите?

— Ну а кто их не любит!.. Очень долгое время для меня любимым праздником оставался Новый год. Позже — день рождения дочери, теперь — внука.

— Можете вспомнить самое веселое новогоднее приключение, произошедшее с Вами?

— Был 1968 год. Я учился в аспирантуре. На улице Ангарской мы с друзьями катались на санках. Неожиданно ко мне на санки прыгнула, мягко говоря, не очень миниатюрная девушка. Мы лихо покатились прямо к большущему забору. Я выставил ногу... Нога сломалась, а девушка осталась цела и невредима...

Ольга МАЙ.

РЭГІЁН

Апаленыя лёсы

Другая за апошнія некалькі гадоў вогненная трагедыя на чыгуначнай станцыі Круляўшчызна ў Докшыцкім раёне зноў папоўніла спіс масавых ахвяр і забрала ноччу адразу чатыры жыцці. Пад раніцу тут загарэлася хата 79-гадовай гаспадыні, дзе пажарныя, акрамя старой, знайшлі трупы дзвюх дачок — 35 і 41 гадоў і яшчэ 32-гадовага мужчыны.

Ужо звыклай прычынай гэтай бяды стала курэнне ў нецвярозым стане некага з загінуўшых. Хоць лічыцца, што "бядняк агню не баіцца", але менавіта людзей з дрэнным матэрыяльным становішчам часцей за ўсё жорстка караюць узгаранні. І ў Бярэзінскім краі падчас адбыўшыхся сёлета 50 пажараў агонь забраў жыцці 8 чалавек, а многім пагарэльцам прынёс вялізныя страты нажытай маёмасці.

Да сямейнага доктара

З адкрыццём у лістападзе ў цэнтры Глыбокага дадатковага аддзялення ўрача агульнай практыкі паменела чэргаў каля кабінетаў у цэнтральнай райпаліклініцы, да якой і дабірацца на ўскрайку горада было нязручна. На створаных чатырох участках меддапамогі ў райцэнтры прымаюць хворых спецыяльна падрыхтаваныя ўрачы і разам з тэрапеўтычнай дапамогай акажуць непасрэдна па месцы пражывання неабходнае садзейнічанне, якое датычыцца пытанняў малой хірургіі, неўралогіі. У гэтым месцы таксама прымаюць аналізы, тут дзейнічаюць жаночы кабінет, перавязачная і працэдурная.

Па новым метадзе сямейныя ўрачы ў раёне працуюць ужо 6 гадоў. Такія цэнтры медыцынскай дапамогі раней стварылі ў вёсках Дзеркаўшчына, Мнюта, а ўслед за горадам неўзабаве яшчэ адно аддзяленне пачне працаваць у Запруддзі.

Перакрыты канал кантрабанды

У сілу сваёй блізкасці да літоўскай граніцы шэраг заманлівых спакус адкрыўся ў жыхароў гарпасёлка Відзы Браслаўскага раёна. Але планам аднаго з іх не ўдалося здзейсніцца дзякуючы сумеснай аперацыі міліцыі і пагранічнікаў Полацкага атрада. У хляве мясцовага жыхара тут нядаўна знайшлі больш чым паўтары тоны спірту і 4510 пачак цыгарэт расійскай вытворчасці. Мяркуючы па ўсім, прызначаліся гэтыя падакцызныя тавары для нелегальнай перапраўкі ў Літву, дзе каштуюць амаль у два разы больш, чым у нашай краіне. Аб гэтым засведчыла выраблёная саматужным спосабам знойдзеная бутэлька гарэлкі з падробнай акцызнай маркай. Сам спірт кантрабандыст прыхаваў у двухсотлітровых бочках, быццам як тэхнічны растваральнік, і не паспеў скончыць свой нелегальны промысел.

Уладзімір ШЫК.

МНЕНИЕ

Не мешайте крестьянину

На заседании Президиума Совета министров, прошедшем на минувшей неделе, обсуждалась программа социально-экономического развития и возрождения села на 2004—2008 гг., которую по поручению А.Лукашенко разработали в соответствующих министерствах. Если она будет утверждена главным из главных, то появится еще один документ, согласно которому крестьян в очередной раз поведут в "светлое будущее".

К 2008 году сборы зерна в стране должны достичь 7,3—7,5 млн. тонн (при урожайности 30 центнеров против 27 сегодняшних). Картофеля планируется накапывать 8 млн. тонн (при урожайности 180 центнеров — на 35 центнеров больше нынешней). Если теперь надой молока от коровы в год составляет 2,2—2,3 тысячи килограммов, то ставится задача довести этот показатель до 4—4,5 тысячи килограммов.

Надо отметить, что намеченные цифры, по сравнению со среднеевропейскими, достаточно скромные. Однако удивляют не цифры, а то, как они должны достигаться. Сказано довести намолоты до 7,3—7,5 миллиона тонн — и баста! Не сами крестьяне определяют свои возможности, а им диктуют, навязывают. При необходимости заставят. Какая уж тут свобода? Словом, инициатива не снизу, а сверху. А без свободы — какая реформа?

К слову, за годы независимости — это уже пятая программа по переводу сельского хозяйства в рыночные условия. По мнению господина Гусакова, все предыдущие выполнены. По-моему, если так будет выполнена и пятая, то белорусское сельское хозяйство в том виде, в котором оно сейчас существует, попросту умрет.

Разумеется, жизнь не вчера началась и не завтра закончится. Сельская жизнь — не исключение. Хоть ее постоянно ломали, мяли, крутили, а потом совершенствовали, вновь ломали... Часто — люди, не имевшие никакого отношения к крестьянскому труду. Например, на центральных усадьбах хозяйств строились Дома культуры, универсамы, Дома быта, бани и прачечные. Уравнять быт сельский с бытом городским — такая ставилась задача. Но, как сказал позже известный политик, хотелось как лучше, а получалось, как всегда. Еще не построили последнюю по плану школу, а в отдельных населенных пунктах их уже пришлось закрывать. Не понял народ такой заботы о себе и стал потихоньку разбегаться. Может, потому, что забота по обязанности всегда остается бездушной, казенной, а может, просто потому, что лучшее — враг хорошего.

Ведь как ни обустраивай сельский населенный пункт, как ни улучшай условия жизни в нем, всегда рядом найдется городишко, жить в котором и легче, и приятней, чем в самой обустроенной деревне. В точности по Киплингу: Запад есть Запад, Восток есть Восток, и вместе им не быть. И не надо думать, что это только у нас. В Европе, например, деревни в традиционном смысле слова давно нет. Промышленная революция, научно-технический прогресс, в широком смысле этого слова, переселили крестьян в города, превратили их в промышленный рабочий класс.

И что характерно, в Европе никто крестьян от переселения не удерживал. А у нас и паспортов лишали, и с пропиской манипулировали. Но только единицы молодых сельских ребят возвращались в родные места после службы в армии. Ехали на БАМ, в Тюмень, в Среднюю Азию, хоть к черту на рога, только бы не в родной колхоз. А все потому, что труд в нем не был ни привлекательным, ни хорошо оплачиваемым. За парнями, естественно, тянулись девушки. И все эти долгие годы деревня держалась не на колхозниках, а на крестьянах. Сперва на тех, кого к труду приучили родители еще до коллективизации, поэтому колхозную работу они исполняли как свою. Потом на их детях. Но со временем крестьяне полностью "околхозились".

Главная беда в том, что не только они сами стали считать себя неудачниками, но и общество оценивало их как людей второго сорта. А что от таких потребуешь: не живут — доживают.

В Европе, подчеркнем, также имел место процесс обезлюживания деревни. На добровольное жительство в ней оставались единицы, но это были крестьяне. Те, кто не представлял себе иной жизни, кроме сельской, иного труда, кроме фермерского. Иными словами, в деревне всегда имелись заинтересованные люди, готовые осваивать новые технологии, современную агротехнику. По этой причине все промышленные разработки легко внедрялись, труд становился все более производительным и начинал давать колоссальную отдачу. При этом крестьянин-фермер оставался личностью и гражданином. Его никто не заставлял, он сам делал свой выбор. А такие уважают себя, их уважают другие. Поэтому, пользуясь разнообразной государственной поддержкой, все свои вопросы решают сами фермеры. Поэтому европейские деревеньки (хутора) внешне выглядят, как рождественские игрушки.

Процесс социального возрождения деревни сейчас можно наблюдать у наших соседей — в Польше, Литве. Везде строятся современные жилые дома, бытовые и производственные помещения, дороги, коммуникации. Крестьянская усадьба имеет весь набор современных бытовых и коммуникационных услуг. А чего нет, то все оно находится в пределах поездки на автомобиле. Вот это и есть социальное развитие и возрождение.

Колхозы, колхозники... Как и десять, и двадцать и тридцать лет назад высокие чиновники подходят к ним огулом, думая, что каждый из них живет в ожидании подачки от батьки-государства. А ведь среди них немало уже и тех, кто считает, что свои проблемы может решить сам, кому не нужны указиловки и селекторные совещания. Эти люди — настоящие крестьяне, а деревня — их дом. А какой хозяин станет жить в плохом доме? Вот он его и обустроит, превратит в игрушку.

Только помогайте ему, но не мешайте, перестаньте командовать им... Тогда, может, он намолотит не 7,5 миллиона тонн зерна, а все десять миллионов.

Константин СКУРАТОВИЧ.

ЧТО ПРОИСХОДИТ В МИРЕ

При взрыве на польской шахте пострадали 43 человека

43 человека получили ранения в результате взрыва на одной из польских шахт по добыче меди. По предварительной информации, причиной аварии стал внезапно сдетонировавший взрывной заряд, сообщает **РИА "Новости"**.

В момент взрыва в шахте "Люблин-Восточный" работали около 500 человек, 150 из них находились в том стволе шахты, где произошел взрыв. Двое раненых находятся в тяжелом состоянии.

В настоящее время пострадавшие при взрыве шахтеры доставляются в ближайшие госпитали. Правительство страны выразило готовность оказать любую помощь раненым горнякам и их родственникам.

Джордж Буш считает, что Путин не держит свое слово

По признанию одного из высокопоставленных чиновников вашингтонской администрации, президент Буш, еще недавно хваливший Путина за достижения в области свободы и демократии, испытывает серьезное разочарование в связи с последними событиями в России, сообщает газета "Вашингтон Пост". Разговаривая недавно с Путиным по телефону, Джордж Буш упрекнул его в невыполнении своих обещаний по реформированию судебной системы в соответствии с международными стандартами и обеспечении гарантий свободы слова.

Члены администрации Белого дома требуют от президента Буша пересмотра своих отношений с Кремлем. По их мнению, последние события в России свидетельствуют об отходе от демократических принципов и укреплении авторитарной власти Владимира Путина. Закрытие последнего независимого общенационального телевизионного канала, прошедшие с многочисленными нарушениями президентские выборы в Чечне, арест главы "ЮКОСа" Михаила Ходорковского и результаты последних думских выборов, на которых победу одержали представители партии власти и националисты, все это вызывает беспокойство президентской команды за судьбу демократических преобразований в России.

Медбрат «из сострадания» убил более 30 пациентов



Житель США, ранее работавший медбратом в нескольких больницах, признался полиции, что с 1987 года, пользуясь служебным положением, убил от 30 до 40 тяжелобольных пациентов "из сострадания", — сообщает агентство "Ассошейтед Пресс". В случае, если заявления бывшего медбрата окажутся правдой, это станет одним из самых громких дел об убийстве в медицинских учреждениях в истории США.

По словам 43-летнего Чарльза Каллена, он использовал для убийства чрезмерные дозы лекарственных препаратов. В настоящее время полиция проверяет записи в 10 больницах, в которых работал Каллен.

В понедельник Каллен присутствовал на предварительном слушании дела и заявил, что намерен признать себя виновным, отказался от адвоката и был выпущен под залог в один миллион долларов.

Бывшему больничному работнику предъявлены обвинения в убийстве и покушении на убийство, однако власти допускают, что этими обвинениями дело не ограничится. На данный момент полиция подозревает Каллена в совершении от 12 до 15 незаконных эвтаназий в больнице города Сомервиль, штат Нью-Джерси, в том числе в убийстве священника римско-католической церкви с помощью повышенной дозы дигоксина.

31 октября 2003 года Каллен был уволен, поскольку внутреннее расследование показало, что результаты медицинских исследований вызывали сомнение.

Джордж Буш: «Поимка Хусейна означает конец пути для него и всех, кто врал и убивал во имя него»

Президент США Джордж Буш выступил в Вашингтоне с заявлением в связи с поимкой бывшего иракского президента Саддама Хусейна.

"Бывший диктатор предстанет перед лицом правосудия, в котором он сам отказывал миллионам", — сказал Буш. В то же время он отметил, что арест Хусейна не означает конца насилия в Ираке.

Также в своем заявлении Буш обратился ко всему иракскому народу. "Вам больше не нужно будет бояться возвращения правления Саддама Хусейна", — сказал президент США.

"Поимка этого человека имела ключевое значение для становления свободного Ирака. Она означает конец пути для него и всех, кто врал и убивал во имя него", — сказал Буш.

"Для скрывающихся баасистов, несущих ответственность за насилие, больше нет обратного пути к коррумпированной власти и привилегиям, которые они когда-то имели", — отметил глава Белого дома.

"Для подавляющего большинства иракских граждан, желающих жить как свободные люди, это событие несет уверенность в том, что камеры пыток и секретная полиция навсегда ушли в прошлое", — говорит Буш.

"В истории Ирака прошла темная и болезненная эра. Настал день надежды. Все иракцы теперь могут объединиться, отказаться от насилия и строить новый Ирак", — сказал президент США.

"Все иракцы, вставшие на сторону свободы, выбрали правильную позицию. У нашей коалиции те же цели, что у вас: суверенитет вашей страны, уважение вашей великой культуры и возможность улучшения жизни для каждого иракского гражданина", — отметил глава Белого дома.

Саддам Хусейн: хроника преступлений

(Продолжение. Начало в №239.)

«Аль-Анфал»

События в Халабье не были ни чем-то из ряда вон выходящим, ни актом отчаяния со стороны режима, увязшего в тяжелой, затянувшейся войне. Нет, они стали частью продуманной, крупномасштабной кампании, получившей название "Аль-Анфал" и имевшей целью истребление и вытеснение курдского населения северных районов Ирака. В опубликованном в 1994 году подробнейшем исследовании организации "Хьюман райтс уотч" содержится вывод о том, что кампания "Аль-Анфал" 1988 года была направлена на истребление иракских курдов и ее результатом стала смерть по крайней мере 50 000, а возможно, и 100 000 человек, среди которых было много женщин и детей.

В 1987—1988 годах Багдад предпринял около 40 атак против иракских курдов, повлекших тысячи смертей. При этом многие погибли и в результате применения режимом традиционных методов: проводившихся военными ночных рейдов для похищения мужчин и подростков, которых потом казнили и сбрасывали в общие могилы. Других членов семей — женщин, детей, стариков — арестовывали на неопределенное время и содержали в чрезвычайно тяжелых условиях или силой выдворяли из домов и отправляли в необустроенные переселенческие лагеря. Как отмечается в докладе "Хьюман райтс уотч", иракские силы сравнивали с землей целые селения — дома, школы, магазины, мечети, фермы, электростанции — все, чтобы искоренить местные общины.

Режим лжи

Главная ложь в исполнении Саддама Хусейна заключалась в утверждении, что он защитник иракского и арабского народа. Наоборот, он защищал только самого себя и собственную власть. Иракскому народу он принес только катастрофу, унижения и репрессии, своим соседям — войну и вторжения, всему миру — угрозы массового истребления.



Саддам отнюдь не отстаивал цели, стоящие перед арабским сообществом, а являлся главным убийцей и мучителем собственного народа. Он отнюдь не объединил жителей Ирака и не построил сильную иракскую нацию, а разорил социальные слои, образующие иракское общество, и превратил некогда одну из самых образованных и процветающих стран на Ближнем Востоке в международного изгоя, функционирующего лишь как придаток к мегаломании и репрессиям Саддама.

По словам Макса ван дер Стула, бывшего специального докладчика ООН по Ираку, багдадский режим — "самый безжалостный диктаторский и тоталитарный режим, какой мир когда-либо видел с времен Второй мировой войны".

Начав свою деятельность в роли политического функционера и исполнителя в иракской партии Баас, Саддам Хусейн на пути к власти сочетал обособленность, беспощадность, угрозы и готовность прибегать к жестокостям, пыткам и убийствам. Во многом карьера Саддама перекликается с карьерой одного из его главных, по отзывам тех, кто его изучал, образцов для подражания — Иосифа Сталина в Советском Союзе. Подобно Сталину, Саддам последовательно прибегал к террору и убийствам — главным атрибутам своего правления. Как и Сталин, он сосредоточил абсолютную власть при культе собственной личности. И, подобно Сталину, он бросал в тюрьмы, пытал и убивал не просто отдельных лиц, а целые группы людей, в которых видел угрозу.

Среди казненных в Ираке режимом Саддама Хусейна — армейские офицеры, обвиненные в заговорах против режима, а также религиозные деятели, заподозренные в нелояльности. Многие другие — просто люди, обвиненные в краже, контрабанде, проституции или в том, что в других странах сочли бы малозначительным преступлением. Эти произвольные убийства — а их число с 1997 года, согласно последнему американскому докладу о правах человека в Ираке, достигло 3000, — представляются еще и частью программы "чистки" иракских тюрем, осуществляемой последние несколько лет. Семьи перебежчиков и политических диссидентов подвергались тюремному заключению, пыткам и казням. Например, в мае 2001 года, согласно американскому докладу о правах человека, "власти, как сообщалось, пытали до смерти мать трех иракских перебежчиков за оппозиционную деятельность ее детей".

Также в 2001 году, согласно докладу, режим казнил 37 политических заключенных за оппозиционную деятельность. По сообщениям прессы, "известный курдский писатель Мухаммад Джамиль Банди Розбаяни был убит в марте после визита, нанесенного в его дом сотрудниками разведки, которые вели следствие по его статьям о проводимых правительством программах арабизации и этнических чисток".

Пытки, категорически запрещенные законодательством и Конституцией Ирака, представляют собой обычную практику, с которой сталкиваются многие арестованные как в качестве наказания, так и для добычи информации. В своем докладе за 2001 год "Международная амнистия" описывает методы, применяемые иракскими мучителями:

"Жертв пыток в Ираке ослепляли, срывали с них одежду и на долгие часы подвешивали их на запястьях. Электрошок применялся на различных частях их тел, включая гениталии, уши, язык и пальцы. Пострадавшие рассказывали "Международной амнистии", как их избивали палками, кнутами, резиновыми дубинками или металлическими прутьями и как они часами оставались подвешенными либо к вращающемуся на потолке вентилятору, либо к горизонтальному шесту, часто в скрученном положении, и в это время их тела неоднократно подвергались электрошоку. Некоторых пострадавших заставляли смотреть, как на их глазах пытают других, в том числе их родственников и членов семей".

Согласно данным организации "Международная амнистия", Ирак имел наихудшую репутацию в плане необъяснимых исчезновений людей среди всех стран мира. Однако власти попросту отказывались реагировать на запросы и призывы международных организаций и соседних стран предоставить хоть какую-то информацию о судьбе тысяч людей.

Пальму первенства среди так называемых "пропавших без вести" держали проживающие на севере Ирака курды. Следом идут шииты, населяющие юг Ирака. Среди исчезнувших и представители других национальных меньшинств, таких как ассирийцы, туркмены и езиды.

Багдад игнорировал неоднократные запросы Кувейта и Саудовской Аравии о судьбе своих граждан, которые были брошены в тюрьмы во время иракской оккупации Кувейта в 1990—1991 годах. Например, удалось установить судьбу только трех из 609 исчезнувших кувейтских граждан.

(Окончание следует.)

Немцы задаволены рэалізацыяй «Трансформа»

Беларускі МЗС задаволены яшчэ больш

Днямі пачалася рэалізацыя другога этапу спецыяльнай праграмы фінансавай падтрымкі Беларусі, якую ладзіць урад Федэратыўнай Рэспублікі Германія. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску пасол ФРГ у Беларусі Хельмут Фрык. Праграма "Трансформ" рэалізуецца не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах Усходняй Еўропы, на яе выдзелена ўжо больш за 40 мільёнаў еўра з федэральнага бюджэту Германіі. Беларусь з гэтай сумы атрымлівае 2,5 мільёна еўра штогод. Як паведаміў сп. Фрык, 60 працэнтаў фінансавых сродкаў у 2003—2004 гг. пойдуць на ажыццяўленне праектаў у галіне грамадзянскай супольнасці, 40% — на эканамічнае кансультаванне і фінансаванне праектаў супрацоўніцтва з урадавымі органамі і мясцовымі ўладамі. Дарэчы, было падкрэслена, што падтрымку сярод няўрадавых арганізацый атрымаюць выключна зарэгістраваныя (мусіць, гэта адна с прычын, чаму наш Мінюст так шпарка зачыняе "нячэсныя" няўрадавыя арганізацыіі — **А.С.**).

Сярод праектаў, якія атрымаюць фінансавую падтрымку, былі анансаваны наступныя: "Інтэрнет-кафэ ў беларуска-германскім Доме моладзі", "Спецыялізаваны часопіс аб магчымасцях адукацыі для дарослых у Беларусі", "Распрацоўка ілюстрацый беларускага школьнага падручніка гісторыі XX стагоддзя", "Арганізацыя майстэрні для інвалідаў у Століне" і іншыя праекты ў сферы адукацыі, энергазберажэння, развіцця малога і сярэдняга бізнесу.

Як адзначыў нямецкі пасол, *"выбух на Чарнобыльскай АЭС і яго драматычныя наступствы паслужылі штуршком, дзякуючы якому нямецкія грамадзяне адчулі прыналежнасць да Беларусі і пачалі працу з ёй. Сёння нямецкія ініцыятывы накіроўваюць у Беларусь прыкладна 40% усёй замежнай дапамогі на пераадольванне наступстваў Чарнобыля"*. "Яшчэ адным *важным матывам,* — дадаў Гельмут Фрык, — *было і застаецца жаданне прымірэння. Жудасныя ўспаміны Другой сусветнай вайны да гэтай пары жывыя ў памяці многіх беларусаў"*.

Намеснік міністра замежных спраў Беларусі Аляксандр Міхневіч падзяліўся з журналістамі сваімі спадзяваннямі на тое, што *"ажыццяўленне дадзенай праграмы забяспечыць паступальнасць і бесперапыннасць у працэсе развіцця стасункаў паміж Беларуссю і Германіяй"*. Паводле яго слоў, асаблівую цікавасць для краіны ўяўляюць праекты ў галіне энергазберажэння, малога бізнесу, студэнцкіх і школьных абменаў, стажыроўкі беларускіх урачоў у Германіі.

Дарэчы, згодна са словамі сп. Міхневіча, тавараабарот паміж нашымі краінамі ў бягучым годзе ўжо пераскочыў лічбу ў 1 мільярд еўра.

Алесь СІЛІЧ.

У музеі дзеда Рыгора

Рыгору Мікалаевічу Бырдзе, жыхару вёскі Восьнікі, што ў Гродзенскім раёне, ужо 93-ці год. Але і ў такім узросце ён не расстаецца з любімай справай — пчалярствам і таксідэрміяй, чым займаецца з юнацкіх гадоў. Нядаўна да ранейшых зробленых іх экспанатаў — чучалаў птушак і звяроў — дабавіліся яшчэ тры — барана, казы і касулі. Прымацаваныя да сцяны, яны ствараюць уражанне, быццам жывыя істоты прасунулі галовы праз адтуліны ў сцяне і з цікавасцю паглядаюць, што дзеецца ў пакоі гаспадара.

Дзед Рыгор даўно жыве адзін, ды не ў адзіноце. Пазнаёміцца з экспанатамі яго заалагічнага музея імкнуцца многія. Вучні заалагічнага гуртка Дэмбраўскай сярэдняй школы, што ў Шчучынскім раёне, не толькі любуюцца "партрэтамі" лясных гасцей, а і дапамагаюць дзеду па гаспадарцы: ягоная хата стаіць якраз на мяжы Гродзенскага і Шчучынскага раёнаў. Такое шэфства вучні ўзялі самастойна па прапанове кіраўніка заалагічнага гуртка.



Дачка Рыгора Мікалаевіча Ніна і ўнук Сяргей жывуць у Гродне, запрашаюць бацьку і дзядулю жыць да сябе, але ён упарта адмаўляецца.

— Не прывык я да гарадскога жыцця, — тлумачыць Рыгор Мікалаевіч, — люблю быць пры справе. Без яе ўсё роўна, што пайсці ў нябыт...

Доўгіх год Вам, шаноўны чалавек!

Ілля БАРЫСАЎ.

На здымку: *дзед Рыгор і яго новыя экспанаты.*

«Студэнты, кру-гом!»

Шмат асабістых і сямейных драм, слёз, крыўды і неспадзяваных грашовых страт — такі вынік раптоўнай каманды "кругом!", якая ў чэрвені бягучага года прагучала са сталіцы для студэнтаў усіх філіялаў Беларускага камерцыйнага інстытута кіравання.

Нагадаем: пяць месяцаў таму Міністэрства адукацыі раптам спыніла дзейнасць сямі рэгіянальных філіялаў Беларускага камерцыйнага інстытута кіравання. Нягледзячы на пратэсты мясцовых органаў адукацыі, заклапочаных такім крутым паваротам у дзейнасці філіялаў паважанай навучальнай установы, і калектыўныя скаргі студэнтаў, іх бацькоў і выкладчыкаў, міністэрства дабілася выканання свайго загаду аб ануляванні ліцэнзій згаданых філіялаў і спыненні навучальнага працэсу для шматлікіх дзяўчат і юнакоў.

З 1 верасня бягучага года заняткі ва ўсіх філіялах інстытута былі афіцыйна спынены. Толькі ў адным Полацку, дзе ўжо колькі год паспяхова працаваў філіял інстытута, перасталі "грызці граніт навукі" больш за 700 будучых юрыстаў, эканамістаў і псіхолагаў. Адной з прычын ануляванне ліцэнзій на права навучання міністэрства аб'явіла тое, што спецыялістаў пералічаных прафесій, маўляў, больш чым дастаткова, і рыхтаваць іх дадатковую колькасць няма патрэбы. Але час паказаў, што такое тлумачэнне ад нячысціка. Сапраўднай прычынай закрыцця філіялаў камерцыйнай ВНУ было імкненне штучна, прымусова папоўніць шэрагі студэнтаў у платных групах дзяржаўных вышэйшых навучальных установ, сёлетні конкурс у якія, паводле статыстычных выкладак, быў рэкордна нізкім. Вядома ж, лягчэй за ўсё павысіць рэйтынг адной ВНУ за кошт ліквідацыі іншых, канкурэнтных.

Студэнтам полацкага філіяла, можна сказаць, пашчасціла. Неўзабаве пасля 1 верасня большасць з іх (каля 400 чалавек) была пераведзена без экзаменаў, паводле дамоўленасці двух рэктараў, у Полацкі дзяржаўны універсітэт на адпаведныя раней абраным спецыяльнасцям факультэты.

Аднак і гэтыя "шчасліўцы" засмучаны тымі нечаканымі пераменамі, што адбыліся ў іх жыцці, бо многія адчуваюць сябе ў ПДУ чужынцамі. Да таго ж хутка выявілася значная розніца ў навучальных праграмах інстытута і універсітэта, якую трэба ліквідаваць за адзін год. Старшакурснікам неабходна здадаць у ПДУ каля дзесяці экзаменаў і залікаў, а тым, хто пераведзены на ніжэйшыя курсы, прыйдзецца плаціць за новы курс навучання. З улікам таго, што за гэты год яны ўжо заплацілі ў камерцыйным інстытуце, грашовыя выдаткі ўзраслі амаль удвая, калі не больш. Зразумела, што ні самі студэнты, ні іх бацькі не маглі прадбачыць такога фінансавага ўдару.

Праўда, кіраўніцтва ПДУ лічыць, што большасць студэнтаў, пераведзеных з ліквідаванага філіяла інстытута кіравання, даволі добра падрыхтаваныя маладыя людзі, ніякай дыскрымінацыі да іх не можа быць, але для паспяховай адаптацыі і далейшага навучання на новым месцы нават самым здольным з іх спатрэбіцца максімум дысцыплінаванасці і самаадукацыі без адрыву ад абавязковай штодзённай праграмы.

У значна горшым становішчы аказаліся студэнты Аршанскага філіяла таго ж Беларускага камерцыйнага інстытута кіравання. У адрозненне ад палачан, гэтым дзяўчатам і юнакам пасля закрыцця іхняй альма матэр няма куды было падацца, бо ў Оршы адсутнічаюць ВНУ, у якія можна было б перавесціся, а ў Віцебску ёсць толькі адна ВНУ з прымальнымі для пераводу факультэтамі — дзяржаўны універсітэт, дзе нават на платнае навучанне небагата вакансій. Словам, атрымалася так, што студэнты філіялаў злашчаснага інстытута аказаліся значна далей ад жаданага дыплома, чым былі яшчэ нядаўна, і вымушаны, так бы мовіць, несці пакаранне за тое, што ў свой час паступілі ў недзяржаўную ВНУ.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ДУХОЎНЫ СКАРБ

Адмахнёмся ад сталінскіх гісторыкаў...

29 кастрычніка на старонках "Народнай волі" пісьменнік Уладзімір Арлоў змясціў цікавы артыкул, прысвечаны вывучэнню нашай айчыннай гісторыі. Я хацеў бы таксама паразважаць на гэты конт.

Спачатку трэба адзначыць, што вытокі гісторыі беларускага этнасу сягаюць у VIII—IX стст, звязаны з канчатковым засяленнем значнай часткі тэрыторыі Беларусі славянскімі плямёнамі і асіміляцыяй імі мясцовых балтыйскіх культур. Працяг узнікнення на карце Еўропы новага народа паскорылі варагі, якія і заснавалі першую беларускую дынастыю ў Полацку. Далей лёс беларусаў вельмі падобны на лёс шмат якіх народаў Еўропы, якія за тысячу год мянялі і свае назвы, і сваю этнічную тэрыторыю.

Мы павінны рашуча адкінуць канцэпцыю сталінскіх гісторыкаў, што прыдумалі ніколі не існаваўшую "старажытнарускую народнасць", якая, на іх думку, і "нарадзіла" беларусаў у XV—XVI стст. Дарэчы, рускія гісторыкі ўжо адмаўляюцца ад Кіева, як ад сваёй міфічнай першасталіцы і звяртаюць увагу на горад Ладагу, што ўзнік як адзін з першых славянскіх гарадоў з дапамогай варагаў у VIII стагоддзі.

Як і французы, ці, асабліва, немцы, у сярэднявечны беларусы мелі не адну, а некалькі дзяржаў, якія займалі тэрыторыю значна большую, чым сённяшняя Рэспубліка Беларусь. Калі мы хочам добра ведаць сваё мінулае, мы павінны вывучаць гісторыю Беларусі ў яе этнаграфічных, а не сённяшніх межах. Варта спыніцца толькі на некаторых прыкладах. Не ўсе ведаюць, што Беларусь была марской дзяржавай і неаднаразова мела выхад да мора і нават валодала калоніямі. Наша першая марская дзяржава — гэта Полацкае княства, якое ў XI—XII стст. мела выхад у Балтыйскае мора і валодала двума васальнымі княствамі на Заходняй Дзвіне — Герцыке і Кукенойс.

У XIV ст. Вялікае княства Літоўскае мела выхад ужо не толькі да Балтыйскага, але і да Чорнага мораў, у XVI—XVIII стст. разам з Польшчай валодала герцагствам Курляндыяй. Курляндыя, дарэчы, мела ваенны і гандлёвы флот, у XVII ст. ёй належалі востраў Табага ў Карыбскім моры і краіна Замбія ў Афрыцы. Гэтыя факты варта ўключыць у школьныя падручнікі па нашай гісторыі.

Мы ніколі не будзем ведаць сваёй гісторыі, калі не будзем вывучаць гісторыю нашай старадаўняй сталіцы Вільні. Спачатку гэта быў горад, заснаваны ў XII ст. крывічамі балтыйскай мяжы, і называўся Крывы, альбо Крывіч-горад. Яшчэ ў 1939—1940 гг. польскія археолагі Галубовічы знайшлі сляды першапачатковай Вільні і надрукавалі вынікі сваёй працы ў савецкім археалагічным часопісе. Аднак пазней літоўскія і рускія гісторыкі ўсяляк замоўчвалі гэты факт, а пры пазнейшых раскопках у канцы мінулага стагоддзя свядома не друкавалі звесткі пра знойдзеную славянскую кераміку.

З XIV ст. Вільня стала асяродкам беларускага праваслаўя, а шматлікія храмы XVI—XIX стст. і зараз упрыгожваюць яе вуліцы і плошчы. Значную ролю ў нашай гісторыі адыгралі і старажытныя замкі ў Троках і Медніках. Таму іх выявы варта змясціць у новых беларускіх падручніках. Апошні раз Вільня была цэнтрам беларускай культуры ў першай палове XX ст. і нават уваходзіла на працягу пяці тыдняў (верасень—кастрычнік 1939 года) у склад Савецкай Беларусі...

Кожны беларускі вучань павінен ведаць і пра такую выбітную беларускую дзяржаву XII—XV стст, як Вялікае княства Смаленскае, дзе жылі нашчадкі крывічоў. Варта толькі прыгадаць ролю трох смаленскіх палкоў у Грунвальдскай бітве альбо ролю Смаленска ў развіцці беларускага летапісання ў XV—XVI стст. Дарэчы, у XX ст. Смаленск таксама некалькі тыдняў уваходзіў у склад ССРБ і нават *адзін дзень* быў яе сталіцай. А як можна забыць тагачасныя нашы гарады Веліж, Невель і Усвяты, што зараз таксама належаць Расіі! Іх умацаваныя замкі не раз сустракалі ворага з поўначы ці з усходу.

Была ў нашчадкаў крывічоў і яшчэ адна дзяржава — Вялікае княства Цвярское, некалі сур'ёзны сапернік Маскоўскага княства. Значную ролю крывічоў адзначылі гісторыкі і ў стварэнні Пскоўскай Рэспублікі, самастойнай дзяржавы ў XIV—XV стагоддзях.

Таму сцвярджэнні, што беларусы не мелі сваёй дзяржаўнасці да 1 студзеня 1992 года, даўно варта здаць на захоўванне ў архіў.

Вельмі важна не забываць і пра лёс тых беларускіх земляў, якія Ленін у 1920 годзе падараваў Латвіі, а Сталін у 1944 годзе (і пазней) Польшчы. Дарэчы, у складзе Латвіі дзякуючы класіку латышскай паэзіі Яну Райнісу беларусы ў 20-х гадах мінулага стагоддзя мелі школы, газеты, часопісы і нават тэатр. Актыўнае беларускае жыццё праходзіць на Беласточчыне, дзе і зараз значную колькасць насельніцтва такіх гарадоў, як Гайнаўка, Бельск і Беласток, складаюць беларусы. У той час калі ў БССР ішло няспыннае змаганне з рэлігіяй, тут будаваліся унікальныя праваслаўныя храмы, і іх выявы павінны ўвайсці ў нашы падручнікі і энцыклапедыі.

Асобнае месца ў нашай гісторыі займае славуты Супрасльскі манастыр з яго унікальным храмам XVI ст., які нядаўна паўстаў з руін дзякуючы намаганням мясцовых беларусаў. Мала хто ведае і пра беларускі музей у Гайнаўцы, які ствараўся некалькі дзесяткаў год.

Было б добра, каб "Народная воля" надрукавала шэраг артыкулаў нашых пісьменнікаў і навукоўцаў на гэтыя тэмы, каб мы перасталі наракаць на свой лёс і ганарыліся сваім мінулым. У газеце варта ўздымаць свядомасць грамадзян Беларусі і накіроўваць яе на захаванне помнікаў нашай гісторыі.

Нядаўна Анатоль Казловіч надрукаваў добры артыкул пра лёс адбудовы Нясвіжскага замка, але не падказаў чытачам, як змяніць тую сітуацыю, якая склалася, да лепшага. Магу падзяліцца вопытам і ўласным досведам.

Нядаўна Лідская гарадская арганізацыя Таварыства беларускай мовы выступіла з ініцыятывай заканчэння рэстаўрацыі замка ў Лідзе. Кіраўніцтва ТБМ напісала адпаведныя лісты ўладам, а газета "Наша слова" змясціла ўзор звароту грамадзян Беларусі да міністра эканомікі з прапановай уключыць у бюджэт краіны на 2004 год неабходную суму. Толькі за два тыдні было сабрана і даслана ўладам больш за трыста подпісаў, і яны прыходзяць да нас кожны дзень. Чаму б такую акцыю не арганізаваць на старонках "Народнай волі"? Калі ўлады атрымаюць некалькі тысяч лістоў з патрабаваннем актывізаваць адбудову замка ў Нясвіжы, сітуацыя абавязкова зменіцца да лепшага.

У свой час, некалькі гадоў таму, мы неаднаразова звярталіся да ўладаў г.Гродна, каб яны, па прыкладзе Мінска, надрукавалі праязныя білеты і талоны для гарадскога транспарту па-беларуску. І вось яны з'явіліся: прыгожыя, новыя, з выявай герба горада і беларускімі надпісамі. Цяпер кожны госць старажытнай Гародні будзе разумець, што знаходзіцца не ў Гродзенскай губерні, а ў знакамітым беларускім горадзе.

Таму трэба кожны дзень, кожную хвіліну пачувацца еўрапейскім народам, які не толькі шануе, але і змагаецца за сваю гістарычную спадчыну, пашырае веды пра яе.

Алег ТРУСАЎ,
старшыня
ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны".

ПРАЧЫТАЙЦЕ!

«Ты, мой брат, каго зваць беларусам...»

Нарэшце, беларускі чытач прычакаў поўнага, не абскубанага і не скалечанага цэнзурай выдання творчага набытку свайго выдатнага песняра першай чвэрці XX стагоддзя Алеся Гаруна (Аляксандра Прушынскага). У залатой кніжнай серыі "Беларускі кнігазбор" толькі што выйшаў і паступіў у продаж аднатомнік яго твораў, у які ўключана практычна ўсё, што выйшла з-пад пяра паэта.

Галоўная тэма творчасці Алеся Гаруна — змаганне за Беларусь, за волю свайго народа, за яго нацыянальнае адраджэнне. У вершы "Ты, мой брат, каго зваць беларусам", прысвечаным "Нашай Ніве", паэт горача клікаў беларусаў шанаваць сваю шматвекавую культуру, мову народа:

Ты, мой брат, каго зваць беларусам,
Роднай мовы сваёй не цурайся;
Як не зрокся яе пад прымусам,
Так і вольны цяпер не зракайся.

Ад дзядоў і ад прадзедаў, браце,
Гэты скарб нам адзін захаваўся,
У сялянскай аграбленай хаце
Толькі ён незабраны астаўся.

У савецкія часы імя Алеся Гаруна было гвалтоўна выкрэслена з беларускай літаратуры, а яго творчасць надоўга апынулася пад забаронай: надта ж не ўпісвалася яна ў вузкія рамкі сацыялістычнага рэалізму. Ды і сам паэт не захацеў ісці з бальшавікамі: ён зусім інакш бачыў шлях, які мог прывесці беларуса да разняволення, а яго краіну да росквіту. "Беларускі шлях" — так называлася грамадска-палітычная газета, якую рэдагаваў Алесь Гарун у 1918 годзе і ў якой адкрыта і смела выказваў свае погляды. Тыя самыя погляды, за якія яшчэ пры цары трапіў у Сібір і правёў у няволі 10 гадоў.

Імя Алеся Гаруна, паэта-патрыёта, класіка беларускай літаратуры стаяла ў свой час побач з імёнамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

Самы буйны раздзел кнігі Алеся Гаруна прысвечаны, вядома ж, паэзіі. У ім сабраны лірычныя і публіцыстычныя вершы, паэмы, вершаваныя апавяданні і байкі, напісаныя ў 1905—1920 гадах. Упершыню змешчаны тут і найбольш вострыя творы, якія доўгі час не дазваляла ўключаць у зборнікі пільная цэнзура. Другі раздзел кнігі — апавяданні, у якіх выдатна праявіўся талент А.Гаруна як празаіка. Трэці раздзел называецца "П'есы для дзяцей". Ён, думаецца, зацікавіць аматараў школьнай самадзейнасці, якія могуць паставіць гэтыя творы на сваёй сцэне.

Вельмі важны для разумення светапогляду паэта і характару яго творчасці раздзел "Публіцыстыка, лісты". Публіцыстычныя артыкулы ён пісаў на самыя злабадзённыя тэмы свайго пераломнага часу — першых двух дзесяцігоддзяў XX стагоддзя. Галоўны пафас яго публіцыстыкі зноў жа — нацыянальнае адраджэнне беларусаў, вызваленне народа з векавечнага сацыяльнага закабалення. Многія артыкулы вельмі надзённа гучаць і сёння.

У кнізе змешчаны і ўспаміны пра паэта, яго сучаснікаў і сяброў. "Выбраныя творы" Алеся Гаруна падрыхтаваў да друку даўні даследчык яго творчасці, пісьменнік і літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук Уладзімір Казбярук.

Ніна КУДРЭЙКА.

ЭКСТРИМ

Театр Аркунова

«Мы горим дольше, чем американцы!» — с гордостью сообщил Аркунов.



— Экстремальные ситуации возникали на съемках? — спросила я у Вячеслава.

— Конечно, но тьфу-тьфу, пока Господь милует, обходимся без жертв, — перекрестился Аркунов. — Снимали, к примеру, фильм "Санта Лючия" под Ошмянами. Согласно сценарию, герой в состоянии сильного стресса вскакивает в "уазик", мчится на предельной скорости, навстречу ему выруливает фура и буквально за доли секунды до столкновения сбивает дорожный знак и уходит в кювет, а "уазик" при этом разворачивается на 360 градусов. Все было рассчитано и продумано до мелочей.

Я был постановщиком трюков и находился с режиссером Владимиром Толкачиковым возле монитора, а операторы снимали с двух точек. Вот начинается эпизод, из-за поворота выскакивает "уазик", с другой стороны — фура, а следом неожиданно — вереница машин, которые норовят ее обогнать. Водитель "уазика" Сергей Цыбульников видит только фуру и понятия не имеет, что сейчас произойдет катастрофа! Побелевший режиссер только и сказал: "Твою мать!" Мы стояли, ждали и ничего не могли поделать. Но Сергей Цыбульников и водитель фуры Саша Мармулевич были настоящими профи и свернули в кювет в считанных сантиметрах друг от друга, не задев ни одной из посторонних машин. Оказалось, что автомобили случайно пропустил милиционер, который перекрывал движение. Он получил от своего начальства по полной программе, а мы с тех пор стали укреплять ряды гаишников на подобных трюках своими ребятами. Вообще, всякое бывает: то ребенок неожиданно на съемочной площадке появится, то велосипедист откуда-то выскочит...

Постановкой трюков в кино Вячеслав Аркунов занимался, еще работая на БТ телережиссером, а затем — директором Дирекции перспективного вещания. После вынужденного ухода с телевидения он создал необычную труппу, которая называется "Трюковой театр Аркунова". Каждый театральный спектакль — это часовое или полуторачасовое действо, состоящее из ряда отдельных сценок, выстроенных по всем законам драматургии. Пишет их сам Аркунов, сюжеты, по его словам, берет из жизни. Но поскольку играют спектакли не просто актеры, а трюкачи, жизнь на сцене получается утрированная: очень много юмора, музыки и рукопашного боя. Ветераны, например, приходят в неописуемый восторг от сценки, где древний дедушка, кряхтя, запросто разбрасывает привязавшихся к нему подвыпивших фашистов.

— Сочетание кино с трюками — привычно, понятно и красиво, тем более что кино усиливает визуальный эффект трюков за счет своих технических возможностей, но как пришла в голову идея объединить трюки и театр? — спросила я у Аркунова.

— Я мечтал об этом еще в студенчестве, когда учился на режиссера театра в Институте культуры. Искал единомышленников, но никто не мог понять, чего я, собственно, хочу. Первую группу трюкачей набрал в конце 80-х — начале 90-х годов. Это были ребята-спортсмены: профессиональные водители, профессиональные мотогонщики, рукопашники и т.д. Мы арендовали спортивный зал, тренировались, но время было тяжелое, перестроечное, фильмы в Беларуси не снимались, киностудию хотели продать с молотка, и группа распалась. А я стал заниматься кино и телевидением.

Нынешний же состав театра начал действовать в 2000 году. Кроме обязательных тренировок, ребята изучают мастерство актера, сценическу речь, химию, физику, анатомию: трюки связаны со здоровьем, не так упал — и уже начинаются проблемы.

— Сколько человек в труппе? Есть ли женщины?

— Сейчас в труппе девять человек. Девушки были, но ушли. Это извечная проблема: пока встречаются с парнями, те разрешают им репетировать, едва выходят замуж, мужья сразу же ставят условие — или театр, или семья!

— Арендуете помещение или в основном гастролируете?

— Своего помещения у нас пока нет. Мы выступали в Минске на празднике города, в Новополоцке, Несвиже, Заславле и других белорусских городах. Поскольку дружим с рыцарским клубом "Орден Северного Храма", которым руководит Дмитрий Нестюк, то часто принимаем участие в их акциях. Ездили с ними, к примеру, в Польшу на Грюнвальдский турнир рыцарей и выступали там со своей программой: мы ведь разыгрываем не только современные, но и исторические сценки. Нас смотрели поляки, немцы, болгары, чехи — и все были в восторге, говорили: у нас такого нет!

Как-то раз поехали мы из Грюнвальда в другой город на экскурсию. Надели исторические костюмы, взяли оружие, кинокамеру, чтобы снять фильм о театре на фоне бесплатных декораций — средневековых замков. А в западной Польше возле трассы очень много уютных кафе. Мы решили попить водички и немного размяться. Что тут началось! Машины стали останавливаться, люди сбегались поглазеть... Хозяйка кричит: "Ребята, побудьте еще хотя бы с полчасика, пиво, кофе, напитки — за счет заведения, у меня, благодаря вам, бизнес пошел!"

— На какую зрительскую аудиторию вы в основном работаете?

— На любую, но самые благодарные зрители — дети, молодежь, и мы привлекаем их для участия в спектаклях. Причем это не подставные, как в цирке, а самые настоящие зрители.

— Им нравится?

— Да они просто пищат от удовольствия! Приглашают нас, скажем, в летний лагерь или школу и просят показать программу минут на сорок. Куда там! Мы ведь даем и познавательную информацию: рассказываем, как делается трюковое кино, как ставятся трюковые спектакли, что такое трюки. Мы всегда говорим: "Нужно старательно учиться! Мы, взрослые, постоянно учимся. Если хотите быть ловкими и сильными, занимайтесь спортом! И никаких сигарет или наркотиков, никакого спиртного! Мы показали, что мы умеем, но и вы, если захотите, можете этому научиться!" Я ведь с детства занимался парусным спортом, дзюдо, восточными единоборствами. И очень приятно, когда приезжаешь еще раз, подбегает мальчишка и говорит: "А я после вашего спектакля на гимнастику пошел!" Или девочка сообщает: "А я таэквондо стала заниматься!" Пусть каждый раз таких ребят будет трое, четверо — и уже мы не напрасно выступили!

— Спектакли платные?

— Мы очень много выступаем бесплатно, особенно для детей и ветеранов. Это и рекламные акции и благотворительные, потому что мы знаем, в какой стране живем и какие у населения доходы.

— Предполагается ли, что в перспективе театр будет зарабатывать деньги?

— Конечно! Не хочу предсказывать, через какое время, потому что не люблю говорить "гоп", пока не перепрыгнул. Думаю расширить основной состав и набрать молодежную группу, чтобы убрать подростков с улицы и уменьшить преступность. Это же здорово — приобщить детей к культуре, научить разбираться, какое кино хорошее, а какое — плохое, объяснить, как оно делается, приучить ребят читать пьесы и любить театр. И разве плохо — научить их владеть своим телом, научить правильно падать, когда поскользнулся, чтобы обойтись без вывихов, переломов и травм, научить защищаться? Пусть не все они станут актерами и трюкачами, но в жизни это им наверняка пригодится!

А еще я мечтаю о глобальных проектах. Я сам пишу сценарии и хочу поставить ряд своих спектаклей, где будут задействованы профессиональные актеры, в исторических местах, в естественных декорациях. Это будут исторические постановки приключенческого, даже детективного жанра. Беларусь ведь богата легендами, а зрители станут участвовать в событиях, которые происходили десятки, а то и сотни лет назад!

— Работа в театре не означает отказ от кино?

— Все мы — действующие каскадеры, не раз снимались в белорусских, балтийских, российских, немецких, итальянских, американских фильмах и по сей день получаем предложения от различных кинорежиссеров. Ребята из труппы работают не только как каскадеры, — их снимают в эпизодах, им дают роли, потому что они — каскадеры-актеры.

Мы изобрели свою жидкость для горения, состав которой знаю только я и двое моих коллег. Она позволяет исполнять трюковой процесс горения как полный, так и частичный без спецкостюма: жидкость наносится прямо на обычную одежду. В кино, когда горит каскадер, мы видим, какой он неповоротливый, мешковатый и неуклюжий. Это оттого, что на него надето много одежды да еще и противогневой костюм. А наша жидкость позволяет человеку прыгать, бегать, кувыркаться, мы это, кстати, демонстрируем на праздничных выступлениях.

— Если жидкость запатентовать, на ней же озолотиться можно!

— Можем быть, но мы пока об этом не думали. На кулибинские подвиги нас подтолкнула бедность. Американец на позапрошлом фестивале "Золотой Телец" — это тот же Оскар, только для каскадеров — получил главный приз за 45 секунд горения. А мы горим дольше, чем американцы: от полутора до двух минут! Сейчас мы готовим фильм, чтобы участвовать в фестивале, потому что по времени горения мы переплюнули всех иностранных коллег! Мы хотим поднять имидж Беларуси, хотим показать, на что белорусы способны, а патент... Патент подождет. Пусть пока у нас будет тайна, которая позволит нам быть единственными в этой области, а дальше — посмотрим!

— Выходит, нет худа без добра: если бы не уход с БТ, не осуществилась бы давняя мечта?

— Я отношусь к ситуации философски: да, я скучаю по тележиссуре, потому что отдал ей много лет жизни, у меня есть задумки, проекты, которые я предлагал осуществить на БТ, но мне сказали, что это — ерунда полнейшая! Я обратился на российские каналы, где сказали: "Какие интересные идеи!" и сразу схватились за них. Видимо, москвичи намного глупее, чем руководство БТ... Так что уход с БТ подтолкнул меня более серьезно взяться за театральную режиссуру, позволил создать театр, который стал для меня отдушиной, театр, где я могу оттачивать свое актерское мастерство и реализовывать свои идеи...

— Если бы на БТ ситуация изменилась, вернулся бы туда?

— Вернулся, если бы на БТ ситуация действительно изменилась. И то, что делаю сейчас, перенес бы на экран.

— С учетом монтажа, спецэффектов и прочих технических возможностей телевидения могло бы получиться очень интересное зрелище...

— Я ведь предлагал на БТ: используйте мой театр, денег за это никто не берет, а наши мини-постановки могут привлечь зрителей... Такого ведь нигде нету, по крайней мере, я ничего подобного с использованием трюков на телеэкранах не видел. Но им это оказалось ненужным.

Сейчас я довольно плодотворно сотрудничаю с СТВ. Канал этот молодой, перспективный и, пожалуй, единственный приличный из всех белорусских телеканалов. Может быть, мои задумки на нем осуществятся...

Анна АРТЮШКЕВИЧ.

Яўген ГУЧОК

Усё яшчэ галера

Новагодняя паэма — не зусім вясёлая і цалкам сур'ёзная

Нібы трава, нібы пясок,
Мы ў Новы год
Штогод з старога года пераходзім.

З вялікім чамаданам
Спяшаецца да нас і гэты Новы год,
А ў чамадане тым — старыя ўсе гады.

У кожным Новым годзе
Ў нас абнаўляецца любоў —
Любоў да грошай, славы і даброт.

У Новы год сабе чаго жадаюць людзі?
Здароўя, весялосці, грошай...
А Бог, а Вечнасць, а Радзіма?!..

А Новы год заўжды для большасці
У шклянках, на відэльцах, у лыжках
І ў эратычных тузаннях бытуе.

Якім ён будзе, Новы год,
Калі ў яго ўязджаем на старым —
На непатрэбшчыне старой ўязджаем?

І гэта свята,
Нібы малярыя,
Трасе, валтузіць чалавецтва.

Ужо ў пачатку самым Новы год.
Нібы петарды й канфеці,
Ўзрываецца, бліскоча й тут жа нікне.

Чым болей выбухаў наўкол святочных,
Тым болей Новы год
Канае сярод нас.

І гэты Новы год, як кожны дзень,
Занадта ў нашых душах
Партызаніць.

Што Новы год для чалавека?
А тое, што перавярнуўся ён
У сне з аднога боку на другі.

Новы год толькі спераду — Новы,
А вось ззаду ён —
Век пячорны пакуль для многіх.

Як выстраіш ўсе Новыя гады,
То атрымаеш год адзін —
Старэнькі і гібенькі.

Так, Новы год праз дзень становіцца старым,
Бо мы старымі у нялепшым сэнсе
Застаемся.

Ці не здаецца вам, панове,
Што Новы год да нас
Заўсёды крочыць задам?

Што Новы год — што год стары —
Усё яшчэ галера,
Грабем мы на якой не ў вечнасць.

На Новы год мы рэпеціруем,
Як жыць на свеце нам
Не трэба.

Туды й назад,
Нібы пясок ў гадзінніку пясочным,
Гады перасыпаюцца, а вечнасць...

Бы спелы яблык,
Мы не здымаем ўпору Новы год,
І ён, бы паданак, ляціць на нас.

Заўсёды Новым годам
Старых гадоў мы дзіркі затыкаем,
І ўсё ніяк іх не заткнем.

І новы год, як год стары —
Не болей, як трава...
Атавай, праўда, Новы выглядае.

Як сена жмук асёл са стогу,
Так Новы год
Хапаем мы.

Калі што добрае (духоўнае)
І прынясе нам Новы год,
Мы хутка тое выпалем і выкінем.

Чым менш дурных людзей
Сустрэнеш ты у Новы год,
Тым больш да вечнасці сябе размесціш.

Што Новы год — што год стары —
То злепак з чалавекаў,
І толькі вечнасць — копія ёсць Бога.

У Новы год, як і у вечнасць
Заўжды гараць агні —
Зялёны, жоўты і чырвоны.

За ўвесь мінулы год
Што добрага зрабіў ты
Для Радзімы?

Што дальш з Радзімай
Ў Новым годзе
Будзе?

Сапраўдны Новы год — і ўзімку і улетку —
Калі прыходзіць Вечнасць,
Калі прыходзіць Бог.

Так, Новы год з усмешкай вечнасці на твары
Не хутка з'явіцца
У межах чалавецтва.

"Народнай волі" — больш народу,
Таму ж народу —
Волі больш жадаем!

P.S. Ганарар прашу пералічыць у фонд абароны газеты "Народная воля" ад яе нядобразычліўцаў.

КРЫМІНАЛ

Сын забіў маці

Адразу два забойствы, у якіх падазраюцца дзеці загінуўшых, былі ўчынены ў Брэсцкай вобласці.

Так, у Брэсце ў сваёй кватэры з ранамі на твары і слядамі ад удараў цвёрдым прадметам на галаве быў знойдзены труп 39-гадовай жанчыны. Па падазрэнні ў забойстве затрыманы яе 17-гадовы сын, які, па расказах суседзяў, злоўжываў спіртнымі напоямі. На месцы здарэння міліцыя знайшла і прылады забойства — гіру і відэлец са слядамі крыві. У дачыненні да непаўналетняга жыхара абласнога цэнтра заведзена крымінальная справа.

Падобнае забойства адбылося ў той жа дзень у вёсцы Шыповічы Кобрынскага раёна, дзе ў адным з дамоў было знойдзена цела 70-гадовай жанчыны. Устаноўлена, што яна памерла ў ноч на 13 снежня ад шоку, выкліканага шматлікімі пераломамі рэбраў, траўмамі ў вобласці галавы, гематомамі і ацёкамі галаўнога мозгу, шматлікімі ранамі ніжніх і верхніх канечнасцяў. Па падазрэнні ў нанясенні цяжкіх цялесных пашкоджанняў загінуўшай затрыманы яе 42-гадовы сын. Ён нідзе не працаваў і ўжо адбыў тэрмін за забойства, учыненае ў 1994 годзе.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

Афіцэру пагражае турма

Не сакрэт, што на тэрміновую службу ў армію трапляюць не анёлы. Побач з даволі прыстойнымі юнакамі туды прызываюць і ёлупняў, а часам — сапраўдных падонкаў, якія могуць давесці да нервовага зрыву самага вытрыманага камандзіра. Але на тое ён і камандзір, каб пры любых абставінах трымаць сябе ў руках, а не пускаць іх у ход.

На жаль, далёка не кожнаму афіцэру гэта ўдаецца. Наадварот, некаторыя афіцэры жорсткасцю ў адносінах да падначаленых паказваюць дрэнны прыклад "ніжэйшым чынам" з ліку старaслужачых.

Віцебская ваенная пракуратура нядаўна адправіла ў суд матэрыялы крымінальнай справы, узбуджанай у адносінах да афіцэра адной з вайсковых часцей мясцовага гарнізона. Афіцэр, прызначаны дзяржурным па сваім падраздзяленні, з невядомай прычыны накінуўся на салдата і, страціўшы ўсялякі кантроль над сабой, так збіў юнака (лупцаваў кулакамі, нагамі, стукаў галавой аб сцяну), што ў пацярпелага адслаілася сятчатка вока, з-за чаго салдата на "хуткай дапамазе" даставілі ў Віцебскую абласную клінічную бальніцу, дзе яму неадкладна была зроблена аперацыя, якая, па словах медыка, прайшла паспяхова.

Афіцэр прызнаў сябе вінаватым і пакаяўся, але суд усё-такі адбудзецца. Артыкул 455 ч.2 Крымінальнага кодэксу прадугледжвае за перавышэнне пасадавых паўнамоцтваў з прымяненнем гвалту пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад аднаго да сямі год.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

17

снежня

СЕРАДА

Усх. 8.24 Зах. 15.47
Даўж. дня 7.23
Апошняя квадра
16 снежня

120 гадоў з дня нараджэння Я. І. Барычэўскага (1883—1934), беларускага літаратуразнаўца

105 гадоў з дня нараджэння М. І. Аляксеева (1898—1985), рускага пісьменніка, заслужанага работніка культуры БССР

95 гадоў з дня нараджэння М. Л. Тарасікава (1908—1965), беларускага жывапісца і графіка

Среда, 17 декабря

БТ

07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Новости.
07.05, 08.10 "Доброе утро, Беларусь!" Информационно-музыкальная программа.
09.05 Мультфильмы киностудии "Беларусьфильм". "Косарь-богатырь", "Песнь о Зубре", "Нестерка".
09.50 Кинокомедия **"Теща"** ("Беларусьфильм").
11.10, 18.05 "Цыган". Сериал (Одесская к/с).
12.15 Комедия **"29 улица"**
14.05 Телеигра "Одноклассники".
14.45, 19.05 "Моя страна".
15.10 Приключенческий сериал **"Амазонка"**.
16.05 "5х5". Программа для молодежи.
17.10 Премьера. "Игорь Добролюбов с друзьями". Документальный фильм ("Белвидеоцентр").
19.20 Народная комедия **"Белые Росы"** ("Беларусьфильм").
21.00 "Панорама". Информационный канал.
21.45 Драматический боевик **"Между жизнью и смертью"**.
23.25 "Чемпионы. Елена Попченко".
23.35 "Клип-обойма".
23.50 "Ночь с Тамарой Лисицкой".

ОНТ

08.00, 09.00, 18.00, 20.30, 23.15 Наши новости.
08.05 Телеканал "Доброе утро".
09.05 "Земля любви, земля надежды". Сериал. 187-я серия.
09.55, 22.05 Детектив **"Участок".**
10.50 "Не только о футболе". Спортивное обозрение.
11.10 Дисней-клуб. "Чудеса на виражах".
* * *
14.40 Комедия **"Медведь".**
15.30 "Угадай мелодию" с Валдисом Пельшем.
16.00 Сериал **"Берег мечты".** 76-я серия.
16.50 "Большая стирка" с Андреем Малаховым.
18.15 "Смешные люди". Программа Лиона Измайлова.
19.05 "Земля любви, земля надежды". Сериал. 188-я серия.
20.00 Время.
21.05 "Магия. Разоблачения".
23.30 Ток-шоу "Окна".
00.15 Тайны века. "Зашифрованная война". 2-я серия.

РОССИЯ

07.45, 19.55 Телесериал **"Линии судьбы"**.
08.45 Сам себе режиссер.
09.45 Вести. Дежурная часть.
10.00, 19.00 Вести.
18.00 Телесериал **"Русские Амазонки"**.
19.30 Местное время. Вести-Москва.
19.50 Спокойной ночи, малыши!
21.00, 22.20 Боевик **"30-го уничтожить"**.
22.00 Вести+.

ЛАД

07.00, 14.00, 20.00 Новости.
07.10 "Реактивный поросенок", "Как дед за дождем ходил". Мультфильмы. ("Беларусьфильм").
07.30 Мультсериал "Вокруг шпионы".
07.55 "Эх, анекдот, анекдот". Юмористическая передача.
08.05, 22.05 Сериал **"Петербургские тайны"** (Россия).
09.00 Площадь искусств. Пианист Иосиф Сергий.
09.30 "Есть только миг..." Александр Медведь.
10.00 "Между нами, женщинами". Тележурнал.
10.20, 21.15 Сериал-мелодрама **"Грешная Анхелика"** (Венесуэла).
11.05 "Уроки тетушки Совы. Арифметика-малышка". Мультфильм.
11.15, 12.55 "Обычный необычный день". Семейный канал.
11.50 Драма "Хам" ("Беларусьфильм"). 2-я серия.
13.20 "Хапун". Мультфильм.
13.30 Ко Дню белорусского кино. **"Успеть до ночи".**
14.10 Мультиклуб.
15.05 Приключенческий сериал **"Наши самые прекрасные каникулы"**.
15.25 "Квака-задавака", "Как Василь хозяйничал". Мультфильмы. ("Беларусьфильм").
15.45 "Не зевай!" Телеканал для детей.
15.55 Тележурнал для школьников "Бум".
16.25 Ко Дню белорусского кино. **"Путь корабля"**.
17.55 Матч плей-офф чемпионата мира 2004 года по футзалу. Украина — Беларусь. Прямая трансляция из Донецка.
19.30 Короткометражный худ. фильм **"Л.С."**
20.15 Колыбельная.
20.30 "Дела семейные".

НТВ

09.00 Сегодня утром.
09.25 Кулинарный поединок: Балаган Лимитед — Мадава.
10.15 Ток-шоу "Страна советов".
11.00, 16.00 "Сегодня" с Ольгой Беловой.
14.35 Ток-шоу "Принцип домино".
16.25 Сериал **"Она написала убийство"** (США).
17.35 Чистосердечное признание.
18.00 "Сегодня" с Михаилом Осокиным.
18.40 Премьера. Детективный сериал "Москва. Центральный округ". 7-я серия.
19.50 Премьера. Сериал **"Чужое лицо"**. 3-я серия.
21.00 "Страна и мир". Главные события дня.
21.35 Красная стрела.
21.50 Боевик **"Федеральная защита"**.

СТВ+RenTV

06.25, 15.25 "Пауэр рейнджерс, или Могучие рейнджеры в космосе". Телесериал.
06.50 "Трансформеры". Мультипликационный сериал.
07.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 "24 часа".
07.50 "СТВ-спорт".
08.05, 18.05 "Минщина. Люди, события, факты".
08.15, 20.15 "Минск и минчане".
08.30, 23.05 "Технология".
08.40 Фильм **"Сверхзвуковой".**
10.10 "Белвидеоцентр" представляет документальный фильм "Первая муза Несвижа".
10.25 "Автопанорама".
10.45 "Горячий лед".
11.10 "Закон и криминал".
11.25 "Дикая планета": "Большой парад животных". Документальный фильм.
12.00 "Истинная любовь". Теленовелла.
12.55 Фестиваль газеты "Минский курьер". 2 часть.
13.50 "Инструктор". Телесериал. 3-я серия.
14.45 "Троица". Документальный фильм цикла "Общий дом".
15.00 "Динозавры". Мультипликационный сериал.
15.50 "Маска". Мультипликационный сериал.
16.15 "Тема дня".
16.50 Боевик **"Случай в квадрате "36-80"**.
18.15 "Планета людей".
18.30 "Инструктор". Телесериал. 4-я серия.
20.00 "СТВ-спорт".
20.25 Детский экран. "Добрый вечер, малыш...".
20.40 "Автопанорама".
20.55 Мелодрама **"Джон и Мэри".**
23.15 "Новости СНГ".
23.30 "Проект "Отражение": "Именем революции, или Привет от Кобы". Документальный фильм.
00.00 Триллер **"Мальтийский Сокол".**

8-Й КАНАЛ

17.30 "Мультпарад" от "Бюргера".
17.45 Фантастическая комедия **"Доктор Дулитл-2".**
19.15 Документальный сериал "Трюкачи Голливуда".
19.25 К-видео "Топ-8".
19.30 Многосерийный фильм **"Два капитана".**
20.45 "Вечарніца".
21.00 Европа сегодня.
21.30 Триллер **"Максимальный риск".**

ТВ ЦЕНТР

04.45 Информационно-развлекательный канал "Настроение".
07.45 Газетный дождь.
07.55 "Люди и тени". Телесериал. 2-я серия.
09.00 Потерянный рай Федора Тютчева.
09.40 Новый фасон.
13.00, 10.00, 17.00, 21.00 События. Время московское.
10.15 Телеканал "Дата".
11.05 "Народные средства". Юмористическая программа.
11.25 Песочные часы.
11.55 Квадратные метры.
12.10 Петровка, 38.
12.30 Деловая Москва.
13.15 "Инспектор Кестер". Детективный сериал (Германия).
14.30 Мода non-stop.
15.00 Регионы: прямая речь.
15.30 Ступеньки.
16.00 "Комиссар Мулен". Телесериал (Франция).
17.15 Тайны русской дипломатии.
18.00 "Разлученные". Телесериал (Мексика).
18.50 Пять минут деловой Москвы.
18.55 Премьера. **"Сокровища мертвых"**. Телесериал, 1-я серия.
19.55 "Невозможные зеленые глаза". Телесериал (Россия). 2-я серия.
20.50 МегаЛото.
21.40 "Версты". Путешествие в Россию.
22.25 Времечко.
22.55 Петровка, 38.
23.15 25-й час. События. Время московское.
23.35 Серебряный диск.
23.55 "Жажда мести". Телесериал (Великобритания).
00.55 "Синий троллейбус". Телефон доверия для полуночников.

EUROSPORT

09.30 Сноуборд.
10.00 Фристайл.
10.30 "Олимпийские игры". Журнал. Повтор.
11.00 Еврoголы. Футбольный журнал. Повтор.
12.00 Футбол. УЕФА. Лига чемпионов. "Счастливый час". Повтор.
13.00 Футбол. УЕФА. Вся Лига чемпионов. Повтор.
14.00 Теннис. Женева.
15.00 Футбол. УЕФА. Сборник Лиги чемпионов. Повтор.
17.00 Футбол. УЕФА. Лига чемпионов. Классика. Журнал.
19.00 Бокс. ТВА. Повтор.
21.15 Конный спорт. Конкур. Ла Корона.
22.15 Конный спорт. 10 лучших. Женева.
23.15 "Олимпийские игры". Журнал.
00.15 К-1. Легенды.
01.15 К-1. Гран-при. Париж. Повтор.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Рэдактар нумара Алесь ДРАБЧУК

Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №448 ад 15 мая 2000 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Нумар газеты аддрукаваны з дыяпазітываў заказчыка на УП «Красная звезда», 220073, г.Мінск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Падпісаны ў друк у 15.00. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж: 28 230 экз. Заказ № 859.